Источник: **«Звязда» - 2013-12-03**

## «Навука маладых: сённяшнія рэаліі і панарама будучыні»

**Невыпадкова кажуць, што найкаштоўнейшы фонд любой дзяржавы – яе моладзь. Маладосць для вучонага – залаты ўзрост: новыя ідэі, іх імгненная рэалізацыя.**

**Прыток у беларускую навуку перспектыўных маладых кадраў зрабіў сваю справу: за апошні час айчынная навука прыкметна змянілася – яна памаладзела.**

Маладыя навукоўцы робяць яе запатрабаванай у эканоміцы і грамадстве, яна дынамічна развіваецца, на яе рахунку ўсё больш дасягненняў сусветнага ўзроўню. Вядома, ёсць і пэўныя праблемы. Найперш гэта тычыцца матэрыяльна-тэхнічнай базы. І як у такіх умовах працаваць маладому чалавеку, які, можа, гатовы на рэвалюцыйныя змены ў навуцы? І наколькі патрэбны сучаснаму грамадству гэтыя вынаходкі?

Каб пагаварыць пра інавацыйнае развіццё, за «круглым сталом» на тэму «Навука маладых: сённяшнія рэаліі і панарама будучыні» ў газеце «Звязда» сабраліся навукоўцы з Акадэміі навук і айчынных ВНУ краіны. Высветлілася, якія навуковыя галіны сёння найбольш цікавяць маладых спецыялістаў, якія вынаходкі могуць змяніць наша жыццё да лепшага і якія перспектывы ў гэтым кірунку.

Пра гэтае і многае іншае чытачы «Звязды» даведаюцца ў адным з бліжэйшых нумароў выдання. Не прапусціце!